# Ад рэдактара

Шаноўныя чытачы!

Чарговы нумар нашага часопіса змяшчае даследаванне, прысвечанае гісторыі ўсходніх славян. Гэта зусім не выпадкова. Першапачаткова планавалася, што часопіс – у сваёй сярэднявечнай частцы – будзе арыентаваны выключна на заходнееўрапейскае сярэднявечча і на краіны Усходу ў гэты перыяд. Але пасля шматлікіх спрэчак мы вырашылі, што сярэднявечная гісторыя усходніх славян заслугоўвае месца ў нашым часопісе на той падставе, што славяністыка, як і іншыя навуковыя галіны сусветнай гісторыі, дастаткова марудна развіваецца ў нашай краіне і, акрамя таго, відавочна, што ўсходнія славяне аказвалі ўплыў на ход сусветнай гісторыі, таму ігнараваць іх мы не можам. Але, пры гэтым, мы хочам папярэдзіць чытачоў і прадухіліць магчымыя памылковыя высновы: вывучэнне ўсходніх славян мае сваю асаблівую спецыфіку: па-першае, як навуковая дысцыпліна, па-другое, як галіна гістарычнай навукі, займацца якой з пункту гледжання беларускай рэчаіснасці і беларускага ўсходнеславянскага менталітэту дастаткова складана ў тым сэнсе, што цяжка зірнуць на падзеі без асабістай уласнай іх ацэнкі, што вядзе да скажэння фактаў. Але размешчаны ў нашым часопісе артыкул дэманструе тое, як гэтага можна пазбегнуць.